Валеры Скакун

# Мяне вецер шукае

Вершы

Валеры Скакун

# МЯНЕ ВЕЦЕР ШУКАЕ

## Вершы

Мінск
2000

Скакун В.У.
Мяне вецер шукае. Вершы. 2000 г. — 64 с.

Паэтамі нараджаюцца амаль усе людзі, але не ўсе яны пішуць вершы. Калі б сталася адваротнае, то паэзіі ўвогуле не існавала б. Валеры Скакун, нягледзячы на ўжо даволі сталы ўзрост, спрабуе ўсё ж утрымацца ў паэтах, дарма што і не філолаг, і не фізік, а ўсяго толькі рабочы з сярэдняй адукацыяй. Спадзеючыся адно на свой жыццёвы вопыт, ён, тым не менш, апантана штурмуе паэтычныя рэдуты, спапяляючы іх агняна-трапнымі ядрамі вобразаў ды метафар... І не дзіўна — яго «сэрца на сонца трымае кірунак»!

Свае дзве нізкі вершаў В. Скакун упершыню апублікаваў у часопісе «Першацвет» (1995, 1996).

© Аўтар В. Скакун, 2000
© Укладанне А. Масарэнка, 2000



Мне здаецца:
я — там,
дзе быў учора.
А дзе зараз я —
тут мяне няма...

* * *

Не доўга
сядзеў я дома —
паклікаў
зноў небакрай...
Сцежкаю незнаёмай
іду
ў тры-дзевяты рай.

Побач са мной —
адзінота,
шырокага стэпу
туга.
На сопках дрэмле
самота.
Над узгалоўем — смуга.

Неба
арлом кружляе.
Мяцеліцца вецер,
бы снег.
Спякота нервы сцінае.
Час
запыняе бег.

Жаданне ісці
наперад —
не азірацца назад,
штурхае,
бы рыбу ў нерат,
як воя ў атаку —
азарт.

Чую
вякоў скананне
азіяцкі матыў.
Бачу
прасвет адхлання
праз чорны
жыцця негатыў.

* * *

Між гор,
акрытых снегам,
вечна белых,
не трэба слоў —
тут воля і спакой.
І сэнс жыцця
настолькі зразумелы,
што бачыш сам сябе
перад сабой.

Палоніць
невядомасці
вусцішша.
Маўкліва шыецца
ў расшчэліны спалох.
Знямелае
ад холаду суцішша
вісіць адчаем
стромасці дарог.

Напятае,
як ціцява,
паветра
слядоў маіх адбітак
скалане.
І ў вечнае
спалучанасці нетраў
аб родным краі
думка прамільгне.

* * *

Няма акрэсленай мяжы
між тым, што ёсць,
і тым, што будзе.
Былое мірсціцца ў імжы,
а прышлае —
шалее ў блудзе.

Не гаспадар я і не госць —
такая выпала мне доля...
Між тым, што будзе,
і што ёсць —
я просты сведка.
І не болей.

* * *

Мяне вецер шукае —
збіваецца з ног.
Мая постаць
знікае
ў завіхрэнні дарог.

У суквецці маланак —
думак рой
нездарма:
на каханне вакханак
спадзяванку няма.

Мяне вецер шукае.
Я шукаю — цябе...
Ён віхурыць над гаем.
Я —
знямеў у журбе.

Недзе ўсё-ткі
насцігне —
наляціць, апаўе,
у дугу мяне выгне,
кухталёў надае.

Упаду ў прыканаўя
залаты ліставей...
Ты,
мая Яраслаўна,
уратуеш мяне.

* * *

Дзе б ні хадзіў я па свеце —
зорка ў небе мне свеціць.

Пырскамі промняў шугае —
цёмны мой шлях асвятляе.

Зорка, няма табе роўні —
сэрца каханнем напоўні

тым, хто мяне ігнаруе,
хто па мне не сумуе.

* * *

Жадаю я волі,
як вецер у полі.
Сваёй грэшнай долі
не цураўся ніколі.
Яна сустракала,
яна абдымала,
яна цалавала і
доўга чакала.

Глядзеў ёй у вочы,
сваім шляхам крочыў.
З дарогі не збочыў
і шчасце прарочыў.
А доля маўчала
і мне спачувала,
і стому здымала,
і сілы давала.

Калі сустракала —
адразу пытала:
— На сэрцы што маеш?
Чаго ты жадаеш?

Як вецер у полі,
жыву сваёй доляй.
Жадаю я волі.
Што мне яшчэ болей?
Нічога не трэба —
свайго толькі хлеба,
радзіла каб глеба...
Ды чыстага неба.

Я — вецер у полі...

* * *

Пералічу
свае гады:
выклічнік,
кропка,
коска,
пытальнік...
А далей —
куды?
Усё ж такі —
няпроста
шлях выбіраць,
калі няма
на сэрцы супакою...
За вокнамі —
ужо зіма,
а я ўсё шчэ
з вясною.

* * *

Бывай... Пакінуўшы мяне,
не страціш ты нічога.
Не жыць нам у маны ярме —
каханне судзіць строга
і не даруе яно нам
таго, што мы, чужыя,
дзялілі шчасце папалам,
імгненні дарагія...

Бывай і не судзі мяне
за тое, што кахаю, —
не жыць нам у маны ярме...
Цябе ж не асуджаю.

* * *

Мне здаецца:
я — там,
дзе быў учора.
А дзе зараз я —
тут
мяне няма...
Вінаваты сам —
ад тваіх дакораў
збег у нікуды,
бы ў вясну зіма.

Ані злосных слоў,
ані павітання
ад цябе не ўчую —
сам я па сабе.
І не трэба мне
думаць
пра спатканне,
і на сэрцы здрада
кошкай
не шкрабе.

Я займеў адразу —
і спакой, і волю.
Больш ужо
не ходзіць
кругам галава.
Сам сабе абраў
я паэта долю,
і дзе зараз я —
тут
мяне няма.

* * *

Каб Бог
даў крылы
лётаць мне,
як птушка ў паднябессі,
жыццё было б,
нібыта ў сне,
спяваў бы птушак песні.

Не марнаваў бы
вольны час,
не зваў на дапамогу б, —
не даў Бог крылы,
ды якраз
маю мне даў
дарогу.

Магчымасць даў
спытаць сябе
пра сэрца хваляванне,
у весялосці быць,
журбе
і марыць
пра каханне.
Перамагчы
дазволіў страх,
даверыў мяне лёсу,
у непагоду
даў мне дах,
у добры час —
нябёсы.

Так і жыву я
на зямлі —
шчаслівы, хоць бяскрылы...
Навошта ж
крылы мне, калі
Бог даў
зямныя сілы?!.

* * *

Да цябе я падыду —
нерашуча гляну ў вочы...
Ты на шчасце ці бяду
запытаеш: «Што ты хочаш?..»

Вочы ў вочы паглядзяць —
таямніцы ўсе прыкмецяць
і дазволяць параўнаць:
я і ты — адно на свеце.

Я і ты — адно аднаму
мы глядзім адкрыта ў вочы...
Непатрэбна больш нікому
гаварыць, чаго мы хочам.

* * *

Я не ў далеч глядзеў —
не найшло празарэнне.
Я кудысьці ішоў —
прамінулі гады.
Я мужнеў і сталеў —
набіраўся цярпення.
Ды цяпер зразумеў —
уцякло шмат вады.

І не тое каб страціў
надзею і веру —
я сябе не згубіў
на развілках дарог.
Адно стаў асцярожны —
не кожнаму веру.
І не кожнаму зычу
сябе каб бярог.

Шэры дождж... Але я
парасонам натхнення
адмяжуюся ад
набрынялай нуды.
І пайду напрасткі —
праз няўдачы, сумненні.
Праз нягодай
запоўненыя брады.

Маё сэрца на сонца
трымае кірунак.
Ты — бясконцасць маіх
да цябе пуцявін.
Цёплы дождж у дарозе —
нябёсаў дарунак.
Цёплы дотык рукі —
любові зачын.

* * *

А я даўно з табой шукаў сустрэчы,
і вось — сышліся нашыя сцяжыны...
У тваім сэрцы недавер трапеча,
маё ж — гарыць ад гэтае прычыны.

Яго агонь, пяшчотна-пранікальны,
разбурыць тоўшчу сценаў недаверу,
і нашае каханне — акт сакральны —
ускалыхне пачуццяў стратасферу.

## Перад навальніцай

Я стаю адзін у начной пустэчы.
Мірыяды зорак паглынае змрок.
Стома апусцілася груганом на плечы.
У які — не ведаю — мне падацца бок.

Аб цень абыякавасці спатыкнуўся месяц,
хмарай абвязаў ён свой зламаны рог.
Шустрыя маланкі кволы золак крэсляць.
Храмам адзіноты мне падаўся стог.

Не зрабіў і кроку я насустрач здзіву —
як з разлому неба ўпаў агняны шар...
Полымя ваўчыцай кідалася хцівай —
стог жудой іскрыўся, грэў нямы абшар.

* * *

Дзень напружана азірнуўся —
ён уходаў як след мяне,
каб начою не абярнуўся
ў вахлака, які байды б‘е.

Ледзь трымае душа раўнавагу —
ад спакусаў ратунку няма.
Што каштоўнасць мае і вагу?
Што — свабода? І што — турма?

Планка прагнасці завысока —
нават мне, Скакуну, не ўзяць.
Ад таго  і жыву шырока,
і не ўмею чужое браць.

* * *

Нібы ў калодзеж,
я гляджу ў тваю душу —
і там, на самым донцы,
аблачына,
з якое холад б‘е...
І ветру-скавышу
між намі разгуляцца
ёсць прычына.

Штось замільгала
ў аблачыне той —
і з прыцемкаў
запозненых амбіцый
сняжынак зольных
высеяўся рой
і ўледзяніў
маёй душы крыніцу.

Цяпер між намі —
холад-звадыяш,
штодзённай слоты
вогкая няпэўнасць...
Уцеха думак —
плыўкі макіяж.
Пачуццяў кіпень —
глыбіні
таемнасць.

* * *

Зара-зараніца.
Узнёслыя словы..
Мірг бліскавіцы
кружыць галовы.

Зліваюцца гукі
ў напеў навальнічны.
Сплятаюцца рукі
ў вянок сімвалічны.

Сэрцаў крыніца
каханнем віруе.
Грэх-шаляніца
сабой ахвяруе.

Мёд пацалункаў.
Пасмяглыя вусны...
Новых лятункаў
клопат нязмушны.

Бацька без маці
дома начуе...
Крык немаўляці
свет увесь чуе.

## Спасціжэнне

За тумана крылом не бачна дарогі.
Спыніўся час на схоне трывогі.

Настрой няпэўны — ні смутку, ні болю.
Няма нараканняў і крыўды на долю.

Нікім не адкрыты. І не зразумелы.
Бываю — адважны, а часцей — нясмелы.

Заблукаў лёс мой у мроіве шэрым...
Імчу ў новы дзень на коніку белым.

* * *

Незакончаная думка —
што прачыненыя дзверы,
што бялюткі ліст паперы
з непачатым вершам белым
аб замоўленым спатканні...

Мне надзейным паратункам
сталі воч тваіх азерцы,
ад якіх у маім сэрцы,
адзінокім і збалелым,
нарадзілася каханне!

## Тут

Тут няма спакою і трывогі —
як і спрэчак, тлуму, мітусні.
Ні ракі вялікай, ні дарогі.
Бездань тут не мае глыбіні.

Зразумела ўсё тут і вядома:
мрояў — скарацечнасць, сноў — імжа.
Тут нязведанае добра ўсім знаёма,
а знаёмае ўсё — знішчыла іржа.

Прыпыніць гады тут немагчыма —
кожны з іх нікуды не ідзе.
З хатулём, напоўненым грашыма,
тут жывуць на хлебе і вадзе.

* * *

Мой дом пусты, у ім няма
твайго цяпла, тваіх сумненняў.
Улетку ў ім жыве зіма
і бляклы цень маіх памкненняў.
І не магчыма прыпыніць
бег часу хуткі на хвіліну.
няма каго мне бараніць.
жыву — нібы напалавіну.

Кранае ж сэрца не туга
і не абрыдласць адзіноты,
не відавочнасці смуга,
не кожнадзённасці турботы —
кранае сэрца напамін
мінулых дзён, былых падзей.
Я без цябе цяпер адзін,
зусім адзін — сярод людзей...

## Трыялет

Сонца ўвечары хаваецца за гаем,
усміхаецца ружовы небакрай.
Нібы там, за небакраем, дзесьці рай...
Сонца ўвечары хаваецца за гаем.

Можа, на душы з якім адчаем,
як знарок, ідзе ў далёкі край.
Сонца ўвечары хаваецца за гаем,
усміхаецца ружовы небакрай.

* * *

Нам з табой не падзяліць няшчасця.
Шчасця нам з табой не адчуваць.
Лёсы нашы не злучыць, не скласці.
Паасобку будзем сумаваць.

Цябе сэрцам болей не шукаю,
толькі марай жыцьмеш ты ўва мне.
Ведаю, цябе ўжо не спаткаю.
Дык навошта мроішся ты ў сне?..

* * *

Спакой, таемнасць цішыні —
наўкол даўніна гор сівая.
Ручай раскідаў камяні
і недзе зноўку іх збірае.

Тут нерухомасць, нібы сон,
сінечай ціхага азерца
бярэ ўсяго цябе ў палон,
трыножыць ногі, рукі, сэрца...

## Час

З чаго складаецца час?
Пытанне турбуе нас...
Недзе ў таежнай глыбі
размытых дарог ланцугі
пытанні не задаюць —
адказы на іх даюць...
Час — і дажджы-сваволі,
што глебу пояць у полі;
час — і бароznaў радкі,
чытаюць іх жаўрукі;
час — і травы маўчанне,
дзіцячых вачэй чаканне...
Час — усё, што навокал,
і ўсё, што — далёка...

Кожнага з нас
цікуе бясконцы час.

* * *

Уцякаюць кудысьці
гады:
ледзь прыкметным адбіткам —
сляды
ад мінулага мроіва
дзён...
Бач, застаўся-такі нейкі
плён.

* * *

На кон
не стаўлю я
ў жыцці нічога.
І дурняў пад увагу
не бяру.
Іду туды,
дзе звужана дарога
ў сцяжынку
на няскошаным лугу.

Гарэза вецер
гойсае
надрэччам,
чмялямі ў красках
скачуць матылькі...
Спыніўся
ад нясцерпнае сінечы,
якой мяне
здзівілі васількі.

І доўга,
аж да самае мо
ночы,
я прастаяў
на беразе ракі,
гадаючы:
ці то каханай вочы,
ці два чароўных
цуда-васількі?

## Стары і маладзён

— Перажытае — не вярнуць, —
кажа грэбліва маладзён. —
Не хачу сябе зноў адчуць
лішняй спіцаю ў коле дзён.

— Перажытае ўсё ўва мне, —
пасміхаецца дзед сівы. —
Яно ў крук мяне часам гне,
ды не тлуміць маёй галавы.

...Лішняй спіцаю ў коле дзён
мітульгаецца маладзён.
Дзед сівы праз свае гады
зноў убачыў сябе маладым.

* * *

На тваіх далонях
затрымаўся вецер,
зблытаў мае пальцы
ў барадзе сваёй,
і застаўся з намі,
нібы нехта трэці,
і ніяк не хоча
нас пакінуць ён.

Вусны пацалункам
быццам і не рады,
сэрцы схаладзелі —
вецер студзіць іх...
Шаптуны, шаптухі
нам даюць парады,
ды між намі вецер —
ён мудрэй за ўсіх.

* * *

Увечарэла...
І, як адметны самы,
быў век справоджаны
ў мінуласць дат.
Зямля ўцалела —
без сусветнай
драмы
век навароджаны
заняў пасад.

Мы не бяздзейна
пражывем
век гэты —
сыпне і нам з неба
манны Бог.
І ліхадзею,
што ад усіх адпеты,
скруцім — даўно ўжо трэба! —
ягоны рог.

* * *

Там,
дзе вечнасць,
там —
іншыя вымярэнні.
Шлях жыцця
там
гарыць мірыядамі зор.
Там —
ні стрэлаў,
ні выбухаў,
ні галашэнняў.
Там —
бязмоўныя душы
сузіраюць прастор.
І мая — прыйдзе час —
з біяклеткі
на волю
адляціць у краіну
заваблівых сноў...
А калі
ў немаўля —
праз стагоддзе ці болей —
абярнуся,
то сэрца з душой
паяднаюцца
зноў.

* * *

Страшная падзея —
калі ты, штангіст,
парваў свой шлунак,
і стала чорным жыццё...
Страчаная надзея —
пажоўклы ліст,
якому адзін кірунак —
у небыццё.

Страчаная надзея —
страшная падзея.

* * *

Я замураваў сябе за краты —
вынес сам сабе такі прысуд.
І свайму становішчу не рады —
не стае адной цябе мне тут.

Любая, прыйдзі на дапамогу —
разбуры душы маёй бетон.
Ружамі ўсцялю тваю дарогу,
разгарну ад сонца парасон, —

завяду ў краіну закаханых,
дзе няма ні суму, ні згрызот...
І пасля, табой закалыханы,
паламлю любоўны эшафот.

* * *

Час не ідзе, а, здаецца, бяжыць.
Куды ён кліча мяне?
Голас ад здзіву няпэўна дрыжыць —
час на ліхім скакуне!

Нервуецца конь. Я спыняю яго —
і ён стае на дыбы,
пытае нібыта: «Трымаеш чаго?..
Гэтым не сцішыш гады!»

* * *

Куды ні іду —
ты побач са мною заўжды.
Адводзіш бяду
ў хвіліну трывожнай жуды.

Завея мяце —
ад ветру цябе захіну.
Каханне цвіце —
да сэрца цябе гарну.

Світанак расой
змывае шчаслівыя сны...
З русявай касой
мроіцца постаць вясны.

* * *

Хто на зямлі я — прыроды дзіця,
подых вятроў, навальніцы?..
Што мне чакаць ад свайго жыцця?
Сілы з якой браць крыніцы?

Ветрам хістае мяне ўбакі,
нібыта ў полі травінку.
Вербай хілюся ў люстра ракі,
а бачу сябе галінкай.

Хто я? І што мне чакаць ад жыцця?
Чаму ў маім сэрцы трывога?..
Здаецца, я не прыроды дзіця,
а грэшнік, забыты Богам!

* * *

Сувязь паміж мною і сусветам —
гэта спеў жыцця мнагагалосы,
супадзенне зорак з маім лёсам,
што даўно супернічае з ветрам.

Гэта не падобна на здарэнне,
не падасца і звычайнай з‘явай.
Ад такой відочнае праявы
ў сэрцы не наступіць суцяшэння.

Дзе каротка — пачынае рвацца:
не шанцуе, штосьці не шанцуе...
Колькі мне зязюля накукуе?
Лепей на яе не спадзявацца.

* * *

Ні зімой,
ні вясной
не была ты
маёй —
нас не звёў у адно
нават роспіс...
І ад
здрады тваёй
засталася са мной
адно
ўсмешка твая —
зораў россып.

* * *

Строі мяняе восень —
за тыдзень, мо, разоў восем
управіцца пераадзецца
і ў люстра дажджоў паглядзецца.

Мяняе восень адзенне —
мастак у яе надзейны:
шые, фарбуе, вяжа...
Аж покуль і снег не ляжа.

## Касавіца

Дзень ніяк не сыдзе ў вечар,
уладарыць, гаспадарыць...
Прымасцілася на плечы
стома дый сабе кімарыць.

Яе похрыпы — уцеха,
сон і мне мярэжыць вочы.
Адгукаецца дзень рэхам
і канае ў цемры ночы.

І як толькі пан світанак
сонца над зямлёй запаліць —
зноў таропкі росны ранак
у пракосы травы зваліць.

* * *

За сабой ты не ўцікуеш збоку,
бегчы ад сябе няма куды.
Сузіраючы сусвет праз вокны,
не пакінеш на зямлі сляды.

Не заўсёды вернешся дадому,
хоць і адышоў на адзін крок...
Ты свой лёс не даручай нікому —
сам развараж ягоны рок!

* * *

Сядзець бы мне дома — снедаць, абедаць,
далёкай дарогі лепш бы й не ведаць.

Для шчасця мне трэба зусім жа нямнога —
воля ды ўвага язычнага Бога;
мець свой акраец духмянага хлеба
і бачыць буслоў у пространі неба...

Хвалюецца сэрца — вяртанне дадому
з далёкай дарогі суцішвае стому.

* * *

Я вопыт набіраў гадамі —
ішоў дарогаю туды,
дзе меў магчымасць з сябрукамі
не шальмаваць свае гады.

Сяброў я клічу сёння: «Браткі,
прыедзьце хоць на нейкі час!..»
Мой шлях, як іх, такі ж не гладкі,
жыццё параскідала нас.

Мы, як нястомныя ваверкі,
бяжым у гонкім коле ўсе...
І нам ні соладка, ні горка —
Гасподзь грахі нашы нясе.

## Сцэнка

Дождж узмацніўся...
Сумна мне.
Вечар стаіўся
ў шэрым акне.

Званок гулліва
трындзіць сваё:
«Не трэба піва,
гарэлка ё?»

Вадзяры пляшку
прынёс... Званю.
«Не ўзяў папаску...
Не адчыню!»

Званок гаворыць?..
Здаецца, ён —
па закусь гоніць,
п-пу-с-стаз-звон.

Прынёс наедку.
Званю ізноў.
Выйшла суседка:
— Ну? Здароў!..
— Чаго трызвоніш?..
Сваю будзі!

— М-м... З дому гоніш?

— Ідзі, ідзі!..
Раскрый віркалы...
Ну — бачыш, хто?..

— Нясі бакалы,
цяпнем па сто...

— Чаўпеш, як попка,
адно і то ж...
Вунь — справа кнопка...
Сваю трывож.

— М-м... Ты — не жонка?
Чужая мне?..
У-у, амазонка!
Джаконда!.. Э-э...
Вось тут — кансерва,
хлеб і сырок...
Вып‘ем-ка, сцерва,
на пасашок!..

— Божы анёлак...
А каб ты спух!
Валі, алкаголік,
у свой катух.

* * *

Пажоўклым лісцем адышла надзея.
Зіма звяла пышноты ўсе ў нябыт.
Зацерушыла снежная завея
душы маёй шматфарбны каларыт.

Ні ў чым не вінен я перад табою,
як і нявінна ты перада мной...
Расстанне наша — расцвіло журбою.
Твае лісты — шматкі маны святой.

Вясну прарочыць снежная самота.
Прамень сустрэчы — ясніць мой настрой.
Вянком наіўных слоў сплывае цнота
ў раку любові вечнай і зямной.

* * *

З вяршыні ў бездань лётае чаўнок —
нябачны нехта тчэ самааддана
матэрыю душы... Ягоны ўток
кужэльным палатном бінтуе раны.

Нястомнаму рупліўцу новы дзень
не абяцае для душы спакою.
Пад сонцам не відзён ягоны цень,
не бачна, што схавана за душою.

Ці не таму і душыць жаба тых,
хто ад бяздушша паліць, забівае?..
Забойца нішчыць выбраных, святых —
і сам ад ран нягоеных канае.

* * *

Узнёсла-цёплых слоў тваіх пяшчота,
нібы магнітам, да цябе хіне.
Вачэй сакраментальная самота
збівае з тропу кожны раз мяне.

І рад бы я забыць на ўсё адразу,
і сесці пры табе на ложка край...
Ды кожны раз я чую тваю фразу:
«Пакінь мяне... Пакінь, але кахай».

* * *

Хачу,
каб свет шчаслівы быў,
каб я
і сам прывольна жыў.
І маіх
думак галасы,
каб
і ў найгоршыя часы
не заляталі
за парог
маіх
пакутаў і трывог.

* * *

Страчана паслядоўнасць —
няма жыцця адчування.
Наперадзе — невядомасць.
А позаду — шлях выгнання.

Ці тою іду дарогай —
чаму не звярнуў дагэтуль?..
Страх заадно з трывогай
цягнуць сумніў дуэтам.

Змяніць яшчэ штосьці можна —
улева вільнуць ці ўправа...
Калі на душы трывожна —
існі яшчэ больш цікава.

* * *

Вечар хавае тваю красу
ў суцемках вусцішы.
Я на руках цябе занясу
ў хату... Ці ўпусціш ты?

Без цябе я жыць не змагу —
акурат бы пабрацца...
Мо заначуем тут, у стагу?..
Навошта вяртацца?!.

А не — гайда са мной на шашу,
паедзем у горад...
Я цябе да сябе прапішу,
знаць не будзеш гора!..

Не ўцякай, сонца маё, пастой!
Без цябе я згіну!..
Аніколі не лашчыў такой
шыі лебядзінай.

І сінечы ў вачах анідзе
такое не бачыў...
Фея з рук уцякла кагадзе —
сэрца маё плача.

* * *

Я пакутую —
чорнае бачу белым,
белае — чорным.
Не лічыце мяне
ні надта смелым,
ні занадта ўзорным —
я пакутую.

* * *

Я ветрам стану на світанку
і адгукнуся ў лесе рэхам,
калі ў мяне пашлеш маланку
з грымліва-перуновым смехам.

Душа мая закамянее,
а сэрца зойдзецца ў адчаі...
Ад пацалункаў ноч святлее
і дзень адданасці страчае.

* * *

Адзінота — журбы паводка,
заліла кахання аблог...
Ты — сарваная з прывязі лодка.
Я — абнесены крыгамі стог.
Нас злучыла ў адно стыхія,
узвіхрыла ў душах пажар...
І ласкавыя мы, і злыя,
і цнатлівыя, і разбітныя —
нас люляе пачуццяў шал!

* * *

Мядовы летні травастой
красуе, набірае сілы.
Тут не адзін пчаліны рой
спрацуе ў лёце свае крылы.

Лугоў злыселі паплавы —
як рукавы, ляжаць пракосы,
і пах духмянае травы
дакджом суцішваюць нябёсы.

## Змест

** * *Не доўга...* ........ *4*
** * *Між гор...* ........ *6*
** * *Няма акрэсленай мяжы...* ........ *7*
** * *Мяне вецер шукае...* ........ *8*
** * *Дзе б ні хадзіў я па свеце...* ........ *9*
** * *Жадаю я волі...* ........ *10*
** * *Паралічу...* ........ *11*
** * *Бывай...* ........ *12*
** * *Мне здаецца...* ........ *13*
** * *Каб Бог...* ........ *14*
** * *Да цябе я падыду...* ........ *16*
** * *Я не ў далеч глядзеў...* ........ *17*
** * *А я даўно з табой шукаў сустрэчы...* ........ *19*
Перад навальніцай ........ *20*
** * *Дзень напружана азірнуўся...* ........ *21*
** * *Нібы ў калодзеж...* ........ *22*
** * *Зара-заранiца...* ........ *23*
Спасціжэнне ........ *24*
** * *Незакончаная думка...* ........ *25*
Тут ........ *26*
** * *Мой дом пусты...* ........ *27*
Трыялет ........ *28*
** * *Нам з табой не падзяліць няшчасця...* ........ *29*
** * *Спакой, таемнасць цішыні...* ........ *30*
Час ........ *31*
** * *Уцякаюць кудысьці...* ........ *32*
** * *На кон...* ........ *33*
Стары і маладзён ........ *34*
** * *На тваіх далонях...* ........ *35*
** * *Увечарэла...* ........ *36*
** * *Там...* ........ *37*
** * *Страшная падзея...* ........ *38*
** * *Час не ідзе...* ........ *40*
** * *Куды ні іду...* ........ *41*
** * *Хто на зямлі я?..* ........ *42*
** * *Сувязь паміж мною і сусветам...* ........ *43*
** * *Ні зімой...* ........ *44*

* * **Строі мяняе восень...* ........ *45*

Касавіца ........ *46*

* * **За сабой ты не ўцікуеш збоку...* ........ *47*
* * **Сядзець бы мне дома...* ........ *48*
* * **Я вопыт набіраў гадамі...* ........ *49*

Сцэнка ........ *50*

* * **Пажоўклым лісцем адышла надзея...* ........ *52*
* * **З вяршыні ў бездань лётае чаўнок...* ........ *53*
* * **Узнёсла-цёплых слоў...* ........ *54*
* * **Хачу...* ........ *55*
* * **Страчана паслядоўнасць...* ........ *56*
* * **Вечар хавае тваю красу...* ........ *57*
* * **Я пакутую...* ........ *58*
* * **Я ветрам стану на світанку...* ........ *59*
* * **Адзінота — журбы паводка...* ........ *60*
* * **Мядовы летні травастой...* ........ *61*

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Валеры Уладзіміравіч Скакун

Мяне вецер шукае

Вершы

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*

Рэдактар *А. Масарэнка*
Карэктар *Ж. Яснотка*
Камп'ютэрны набор і вёрстка *Д. Андрэеў*